**Нуждзіна Т.С. (Мазыр, Беларусь)**

**Навальнічныя дажджы ў сістэме паэтычнай вобразнасці лірыкі Ніла Гілевіча**

Кожны раз, калі спрабуеш ахапіць бязмежнасць мастацкага свету Ніла Гілевіча, перацінае дыханне ад немагчымасці ўвабраць у сябе прасторавыя гарызонты быцця яго слова, перажыць адчайны крыгалом эмоцый, рухомасць, зменлівасць пачуццёвага рэгістра, абумоўленага штодзённай прагай здзяйсненняў.

Для таго, каб расчытаць усё, што хвалявала душу і свядомасць, сэрца і розум пісьменніка і яго героя-творцы, патрэбна паслядоўная і мэтанакіраваная заглыбленасць у мастацкія пошукі Ніла Гілевіча, чый літаратурны шлях доўжыўся, лічы, сем дзесяцігоддзяў. Гэта ў звыклым лічбавым фармаце. Калі ж вымяраць той шлях распятасцю душы на крыжы сумлення і ахвярнага служэння найвышэйшай праўдзе пра жыццё-быццё беларуса, яго гістарычны лёс і сучасную непрыкаянасць, тады творчая дарога Майстра набывае зусім іншы прасторава-часавы маштаб. А пачыналася тая дарога ў літаратуру з радасна-сонечнага ўспрымання рамантычнай душой падлетка навакольнага свету, рытмаў вясновага жыцця і гаючай цішыні вечаровага сутоння, што лагодзіла пачуцці спакоем пасля перажытых жахаў вайны. Мяркуем, зусім невыпадкова першы том свайго “дваццацітрохкніжжа” (М. Скобла) Ніл Гілевіч адкрыў вершам “Выйду” (1946) з такім вызначальна-сутнасным прызнаннем: “Ну хіба не шчасце – / Жыць і працаваць?” [2, с. 13]. Працаваць жа над словам-думкай, словам-вобразам ён будзе гэтак ашчадна і рупна, як калісь продак-хлебасей на родным загоне. Умеў амаль па-язычніцку радавацца добраму сонцу і шчодрым нябёсам на першы гром і вясёлы гоман дажджу. Радасна бачыць лірычнаму герою, як “абмыўся заспаны дол”, як жыццядайнай сілай напоўніўся прастор любай весняй зямлі: “Гром усіх абудзіў ад сну: / Будуць краскі ўсміхацца ветла, / Будзе жыта спяшацца ў лета, / Буду славіць гром і вясну” [2, с. 22].

У дадатку да збору твораў пісьменнік змясціў развагі 1963 года пра творчае выкарыстанне старых народных звычаяў і абрадаў у справе выхавання ў моладзі “пачуцця клопату аб зямлі і ўраджаі”. Нагадае аўтар пра цудоўную народную традыцыю, як у дзень дажынак жнеі вярталіся з поля: лепшая з іх – “царыца жніва – ішла наперадзе, а за ёю ўсе астатнія, спяваючы хвалу ўраджаю, зямлі і сонцу, дажджу і ветру” [1, кн. 2, с. 13].

Вось так на пачатку 1960-х гадоў творца абазначыць асноўныя складнікі вобразна-эстэтычнай сістэмы сваёй паэзіі: зямля, сонца, вецер, дождж. Гэта, так бы мовіць, нязменныя “жыхары” мастацкай прасторы яго лірыкі. Аднак яны пастаянна дапаўняюцца новымі адценнямі, пашыраючы ўнутраную змястоўнасць пэўнага вобраза. Узбагачаецца, такім чынам, вобразная сістэма ідэйна-філасофскім зместам, творы набываюць глыбокі падтэкст; узмацняецца сацыяльна-грамадскае гучанне лірыкі Ніла Гілевіча. Па-новаму акрэслівалася фактурнасць яго постаці, магнетызм думак і неўтаймоўны свет эмоцый. У залежнасці ад узросту, жыццёвага і літаратурнага вопыту, эмацыянальна-псіхалагічнай узрушанасці, высокай асвечанасці душы або працятасці ўсёй істоты пісьменніка незагойным болем за лёс

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

краіны, яе будучыню кожны раз па-новаму “працуюць” на ідэйна-мастацкі змест твораў і згаданыя вобразы.

Першыя два дзесяцігоддзі быцця ў літаратуры сталіся для Ніла Гілевіча асабліва шчаслівымі. Маладосць, любімая справа, чыстае мірнае неба, суладнасць сямейнага быцця, а над усім столькі планаў, ідэй, захапленняў, якія здзейсніць аднаму здавалася неверагодным. А ён, акрылены, “вымыты ў сонца сяйве”, славіць самае важнае, адвечнае, на чым заўсёды трымаецца жыццё: працу, красу, цішыню, родны край і зямлю – калыску яго дум і памкненняў. Паэт ад зямлі, ад вясковай прыроды, ён добра ведаў магутную ўладу вясновых дажджоў над лёсам палеткаў, лугоў і лясоў, над спадзевам вяскоўца, што будзе ў налецце з хлебам.

У вершах 1940–1950-х гадоў вобраз дажджу – гэта перш за ўсё разгорнутая карціна вясновага абнаўлення, сімвал ачышчэння зямлі, нараджэння новага жыцця, якое вітаецца грымотным гулам першых навальніц і шчодрых дарункаў нябёсаў. Лірычны герой многіх вершаў (“Першы гром”, “Вячэрні лівень”, “Маёвае”, “Свята зямлі”) існуе на хвалі поўнага суладдзя з музыкай дажджоў, іх магічнай сілай пераўтвараць свет. Эстэтыка вобразнага мыслення паэта, які бачыць і ўзнаўляе ў слове сваю амаль першародную радасць зліцця-растварэння ў боскай раскошы і хараstве прыроднага наваколля, скіравана як на фіксацыю нечаканых, імгненных перамен у абліччы роднага да болю свету, якія прыносяць вясновыя (маёвыя), летнія або жнівеньскія навальніцы, так і на акцэнтацыю раскрытасці душы лірычнага героя насустрач таму, што адбылося з наваколлем і станам персанажа пасля. Пакуль і дождж, і гром, і вецер (“ціхі ветрык”), і сонца (заўсёды “залатое”), і хмара (“хмурынка”, “хмарка”) скіраваны на гарманізацыю думак, настрояў, жаданняў творчай асобы, на іх тоеснасць высокаму хараству, створанаму нябёсамі на сходзе дня, уначы або на самым золку. Час вечаровага сутоння настройваў душу і слых на цішыню. Гукі набывалі характэрную выразнасць, а для мастакоўскай індывідуальнасці Ніла Гілевіча ўласціва якраз не малюнкавасць карцін, а іх гукавая напоўненасць: музыка свету, пачутая і слыхам, і душой.

Разам з паэтам мы чуем, як “дождж да дня шумеў вясёла” [2, с. 97], бачым, як “даль, абмытая дажджамі шпаркімі, / Ясным вырысам чаруе зрок” [2, с. 69], радуемся “шэпту ліўняў з лісцем і травой” [2, с. 69]. Пабываем на сапраўдным “свяце зямлі”, калі нават “ранак вытарашчыў вочы, / Як дзіця, глядзіць наўкола” [2, с. 97]. Такое па-язычніцку адухоўленае ўвасабленне прыродных з’яў стане праявай знакавасці ў светапоглядных і эстэтычных канцэпцыях пісьменніка. Нават ліўні ў творах паэта ў пару станаўлення таленту асобыя: цёплыя, шчодрыя, таямніча-суцішаныя або вясёла-шпаркія “з пераплясам”. Яны напаўняюць душу жывой і нежывой прыроды непераможнай музыкай жыцця. Іначай і быць не магло: герой-творца толькі ступіў на парог самастойнага жыцця. Ён захоплена верыць у перспектыву шчаслівай рэалізацыі сваіх прыродных сіл і мастакоўскіх здольнасцей: “…Колькі слаўнага, прыгожага / У жыцці чакае нас!...” [2, с. 29]. Вось таму і хмурынка, што вырастала, набіралася навальнічнай сілы, застаецца лагодна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гарэзлівай, хоць і бухматай. Не толькі на зямлі абмыла ўсё і ўсіх, але і зоры заззялі так ярка, нібы і тут парупілася гарэза – “сабой іх да бляску нацёрла” [2, с. 41].

Аднак бліжэй да сярэдзіны 1950-х гадоў малады паэт напоўніцу зведае подых навальнічных хмар, злосныя грымоты абсурднай крытыкі. Душа творцы правяралася на злом, а талент – на трываласць і вынослівасць. Летам 1953 года Ніл Гілевіч перажыў, па яго словах, страшэнны ўдар. “Насуперак папярэдняй дамоўленасці кіраўнікоў СП і ўзгаднення «там, дзе трэба» (а ў тыя часы ўсё ўзгаднялася ў ЦК) у Саюз тым разам не прынялі” [3, с. 112]. Раўнадушна-вялым выступленнем не зрабіў уражанне на прысутных дакладчык па творчасці паэта Аляксей Русецкі, а ў час абмеркавання вершаў крытык А. Кучар “забіў, стоўк Ніла Гілевіча на горкі яблык” [3, с. 112] і канчаткова пахаваў надзею летуценнага паэта на членства ў творчым саюзе. У сакавіку 1954 пры паўторным абмеркаванні яго паэтычных набыткаў Ніл Гілевіч быў аднадушна рэкамендаваны ў Саюз пісьменнікаў.

А па вясне наступнага года пры абмеркаванні рукапісу першага зборніка вершаў на секцыі паэзіі (на прадмет рэкамендацыі ў друк) зноў раздаўся пагрозлівы навальнічны гром. “Масціты” на той час М. Лужанін “тонам суддзі і аракула” скіраваў увагу прысутных на адну, па яго меркаванні, сур’ёзную і небяспечную рэч – “ушчэрбнасць настрою і ідэйна-эстэтычнай пазіцыі лірычнага героя” [3, с. 120]. У тым, што навальнічнай ноччу ў маладой прыгожай грушы адвіхнула сук і па галіне, уквечанай пахучым цветам (верш “Пры дарозе пыльнай, шумнай…”), хтосьці пераехаў калясьмі, звышпільны крытык убачыў адсутнасць у паэта высокіх ідэйных крытэрыяў, афіцыйна прадпісаных тагачаснымі ідэолагамі ад мастацтва. Падобныя акалічнасці (творчы лёс пісьменніка зазнае іх столькі, што як толькі сэрца вытрымлівала) будуць адчувальна ўплываць на ідэйна-эстэтычную змястоўнасць вобраза дажджу, на яго функцыянальна-стылёвае прызначэнне.

Напрыканцы 1950-х гадоў вершамі “Быў вечар…”, “Дождж прайшоў” паэт катэгарычна засведчыць: у яго мастакоўскім успрыманні сучаснай рэальнасці адбыліся істотныя змены. Той вечар, калі творца думаў “песню нягучную скласці / Пра мілую згоду нябёс і зямлі” [2, с. 64], стаў вечарам адчування вялікага болю паэта-грамадзяніна. Свой працяг накрэсленая думка знойдзе ў вершы “Дождж прайшоў”, які складаецца з дзвюх частак. У кожнай з іх фраза “дождж прайшоў” становіцца адпаведным камертонам настрою душы: у першай – вясновы хмель жыцця; у другой – атрутны, смертаносны лівень. Гэта дождж пакут, што “стаіць у небе чорнай хмарай” [2, с. 71].

Але на пэўны час, да сярэдзіны 1970-х гадоў, і чорныя хмары, і грымоты з ліўнямі не будуць трывожыць душу паэта. Усё адступіць перад яго захопленасцю фальклорам. А яшчэ была сур’ёзная работа над перакладамі з балгарскай паэзіі. Шмат дала Нілу Гілевічу і паездка (і неаднойчы) на Балканы. Калі ж і згадваецца цяпер у яго творах дождж або навальніца, то каб выявіць захопленую новымі адчуваннямі душу героя-творцы, настроеную на хвалю шчаслівага паразумення з іншай, бывае, зусім незнаёмай асобай, што нейкім чынам зачапіла за жывое (паэма

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

“А дзе ж тая крынічанька?”, “Вазьмі мяне пад парасон”). У згаданай паэме навальнічны дождж з маланкай, што “залатым даўжэзным поясам” неба ўраз перавіла, валадарыць бязбоязна і весела, адпаведна душэўнаму ўзрушэнню героя твора. Кранальна, светла прычынілася да настрою фалькларыста дачка-студэнтка і яе маці, гасцінная гаспадыня, і радасць сустрэчы з народнай песняй. Адбылося свята душы.

Жартаўлівая просьба-зварот лірычнага героя (у думках, вядома), які апынуўся нечакана пад дажджом, што хвастаў неміласэрна, да шчаслівай уладальніцы парасона, – усяго толькі мастацкая ўмоўнасць. Паэту карціць паведаць далёкім чытачам чужой краіны пра тое, “чым багаты дома”: “Захочаш – госцяй мілай запрашу / У нашы вёскі, пушчы і даліны, / Пад наша сонца і пад нашы ліўні / У родны край цябе я запрашу” [2, с. 194].

З просьбай-патрабаваннем звяртаецца лірычны герой верша “Зрабіце дождж!..” да вучоных-фізікаў. Аднак ні навукоўцы сваімі адкрыццямі, ні паэты вершамі не могуць напаіць усмяглы дол. Так і чуецца ў вершы водгулле спрэчкі паміж лірыкамі і фізікамі, што ўсчыналася не раз у 1960–1970-я гады.

Асабліва абвострана чуйная душа Ніла Гілевіча рэагавала на балючыя праблемы грамадска-палітычнага жыцця краіны апошніх дзесяцігоддзяў. Поўныя глыбокага падтэксту, напрыклад, вершы “Загадка прыроды”, “На краі дажджу”, “Дыфірамбы доўгачаканаму дажджу” і інш. Традыцыйныя вобразы хмары, грому, дажджу, маланкі, навальніцы набываюць досыць часта алегарычны змест. У задушлівай атмасферы ўяўных дэкларацый аб перспектывах духоўна-культурнага быцця нацыі паэт выкарыстоўвае вобраз дажджу як магутнай сілы, здольнай ажывіць усмяглае, усохлае мысленне сучаснікаў.

Па вяліка рахунку вобразы навальнічных дажджоў у творах паэта апошняга часу – гэта выяўленне духоўнай, творчай і грамадзянскай актыўнасці паэта, яго бунтоўнай, смелай і заўсёды неспакойнай душы вялікага Беларуса.

Літаратура

1. Гілевіч, Н. Дадатак да збору твораў у 23 т. / Н. Гілевіч. – Мінск, 2016. – Т. 25. Кн. 2 : Публіцыстыка. Артыкулы. Прамовы. Інтэрв’ю і гутаркі. Нататкі. – 452 с.
2. Гілевіч, Н. Збор твораў : у 23 т. / Н. Гілевіч. – Мінск : ГА БТ “Кніга”, 2003. – Т. 1 : Вершы: 1946–1990. – 416 с.
3. Гілевіч, Н. Збор твораў : у 23 т. / Н. Гілевіч. – Вільня : Наша Будучыня, 2008. – Т. 23 : Між роспаччу і надзеяй : абрыс пройдзенага шляху ў святле адной мары. – 480 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ